**Сталі піянерамі ў Дзень воіна-інтэрнацыяналіста**

15 лютага 2017 года ў піянерскай дружыне імя Георгія Анатольевіча Татура адбыўся піянерскі збор "Абпаленыя агнём Афганістана", прысвечаны Дню воіна-інтэрнацыяналіста. Піянеры 5 – 8 класаў пазнаёмілі прысутных з гісторыяй вайны ў Афганістане, з гераічным жыццёвым шляхам удзельніка афганскай вайны, аднавяскоўца Георгія Татура. Звярнулі, таксама, увагу на тое, з якімі цяжкасцямі прыйшлося сутыкнуцца салдатам у чужой невядомай краіне, прачыталі вершы пра афганскую вайну. З болем у сэрцы расказвалі піянеры пра тое, што вельмі многа маладых салдат – нашых землякоў - не вярнулася з той страшнай вайны, у тым ліку 5 чалавек з нашага раёна: Жураўлёў Аляксандр Барысавіч, Кузьміцкі Мікалай Іванавіч, Татур Георгій Анатольевіч, Федарака Васіль Мікалаевіч, Філончык Сяргей Пятровіч. Мінутай маўчання піянеры ўшанавалі памяць загінуўшых герояў.



**Фота. У час збору піянерскай дружыны**

Запамінальнай падзеяй для вучняў чацвёртага класа стала тое, што ў гэты ўрачысты святочны дзень яны сталі піянерамі. Піянерская дружына ўстановы адукацыі папоўнілася шасцю піянерамі – актыўнымі, адказнымі, цікавымі, якія гатовы кожны дзень тварыць дабро на карысць сваёй Радзіме. Мы, старэйшыя піянеры, ад усёй душы павіншавалі сваіх малодшых сяброў, звярнулі іх увагу яшчэ раз на тое, што піянер ва ўсіх добрых пачынаннях павінен быць першым. А сімвалы піянерскай арганізацыі яскрава расказваюць нам пра незабыўныя гераічныя справы піянераў, якія разам з дарослымі ва ўсе часы абаранялі наша Радзіму ад ворагаў, якія ў наш час сваімі справамі ўпрыгожваюць нашу родную зямлю.

З гонарам павязалі старшакласнікі вучням чацвёртага класа піянерскія гальштукі. Яркім полымем будуць гарэць яны цяпер і на іх грудзях.

Агонь Афганістана ў далёкіх васьмідзесятых гадах мінулага стагоддзя абпаліў душы маладых салдат. Але яны выканалі да канца

свой інтэрнацыянальны абавязак і сталі для ўсіх пакаленняў дзяцей і дарослых прыкладам мужнасці і вялікай адказнасці за даручаныя справы ў імя росквіту жыцця на зямлі.

*Старшыня піянерскай дружыны імя Георгія Анатольевіча Татура “Турэцкі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-сярэдняя школа” Чачотка Паліна*